# «ПАЙДУ «БАРЫНЮ» СКАКАЦЬ»



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **1.** «Рыба з радасці такой // Пайшла ў скокі талакой, // А за ёю ... , наварыўшы кашкі». З вершаванай казкі Я. Коласа «Рак-вусач». **5.** Хто людзей весяліць, за таго ўвесь ... стаіць *(прык.).* **7.** «Пайду барыню скакаць, // Надзену ... . // Буду ножкі падымаць // Вышэй табурэткі»; прыпеўка да імправізаванага танца «Барыня». **8.** «... , мае грачанікі, // ... мае ячныя»; прыпеўка да танца «Грачанікі», які танцавалі на Магілёўшчыне, на вяселлі. **9.** «Дзед боб малаціў, // ... падсявала, // Дзеткам раздавала»; прыпеўка да танца «Боб малаціць», які быў распаўсюджаны на Віцебшчыне. **12.** ... — радасць, танец — шчасце *(прык.).* **15.** Тое, што і пуня. **16.** Герой беларускіх казак, волат. **17.** «А ну, ... , — тра-ля-ля! // Патанцуем, сват Грамыка, // Каб аж бухала зямля!». З паэмы Я. Коласа « Сымон-музыка». **18.** «Саўка ды ... ладзілі дуду — // Павесяліцца, ды прагнаць нуду». З беларускай народнай песні «Саўка ды ... ». **20.** «Сербіяначку» скакаць, // Трэба многа песень знаць. // А як знаеш штук пяток, // Так садзіся ў ... »; прыпеўка да хуткага танца «Сербіянка». **22.** Назва танца, аднага з варыянтаў беларускай полькі; «А ты, ..., не глядзі, // Што кажух падраўся. // То я з Тэкляю сваёй // Ўсю ноч мілаваўся». Прыпеўка. **24.** Каб не скрыпка і не ... , дык музыка свіней бы пас *(прык.).* **26.** «Пад дуду і пад ... // Топне, прыспявае. // Сцеражыцеся ўсе людзі: // Беларус гуляе!» З верша Я. Купалы «Ігнату Буйніцкаму». **27.** «... ўсмешка — паўпацалунка». К. Макушынскі. **28.** «Узяўшы хустачку, ... , пайшла «Мяцеліцу» скакаць». З паэмы «Тарас на Парнасе».

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **1.** «Паміж Польшай і Расіяй // ... беларуская». З песні «... беларуская» (словы Л. Дранько-Майсюка, музыка І. Лучанка). **2.** Танцавальны ... ; тое, што і па. **3.** «А во і сам Юпітэр з Вестай, — // Пусціўся, стары хрэн, у ... , // Як бы жаніх перад нявестай». З паэмы «Тарас на Парнасе». **4.** Закончаная частка спектакля. **6.** Рускі народны танец з моцным прытупваннем. **10.** Танец, у якім трое ўдзельнікаў становяцца тварам у круг і круцяцца, падскокваючы; танец быў распаўсюджаны на Палессі. **11.** «Бобік Жучку ўзяў пад ручку, // Сталі Польку танцаваць. // А ... — сіні носік — // Стаў на дудачцы іграць». З жартоўнай «Сабачай полькі». **13.** Танец, роднасны ўкраінскаму, які выконваюць з прысядкамі, прыпеўкамі; іншая назва — «Гапачок». **14.** Парны бальны танец; «... — гэта настальгія, мінулае». А. Пасенка. **17.** Частка бота. **19.** Бацькі елі журавіны, а ў дзяцей ... *(прык.).* **21.** Сэрца весяліцца — і ... цвіце *(прык.).* **23.** «Вось так пляшуць, прыпяваюць, // Хохат, лопат, крык і ... » З паэмы В. Дуніна-Марцінкевіча «Гапон». **25.** «З усіх радасцяў на зямлі найлепшымі я лічу тры: каханне, ... і танцы». Гамер.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Птушкі. 5. Свет. 7. Балеткі. 8. Гоп. 9. Баба. 12. Песня. 15. Адрына. 16. Асілак. 17. Хлопча. 18. Грышка. 20. Куток. 22. Янка. 24. Бас. 26. Цымбалы. 27. Адна. 28. Венера.

**Па вертыкалі:** 1. Полька. 2. Шаг. 3. Пляс. 4. Акт. 6. Трапак. 10. Аколушка. 11. Барбосік. 13. Гапак. 14. Танга. 17. Халява. 19. Аскома. 21. Твар. 23. Зык. 25. Сон.

## Даты Падзеі Людзі

### 4 ВЕРАСНЯ

У краіне

**1776** год — выйшаў указ Кацярыны II аб стварэнні Полацкай губерні — адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў Расійскай імперыі.

**1859** год — нарадзіўся Браніслаў Ігнатавіч Эпімах-Шыпіла, беларускі выдавец, мовазнаўца, кандыдат гісторыка-філалагічных навук, сапраўдны член Інбелкульта (1924). З 1925-га — рэдактар, у 1927—1929 гадах — старшыня камісіі Інбелкульта па складанні слоўніка беларускай мовы. Збіраў матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, фальклору Беларусі. Ініцыятар стварэння, адзін з кіраўнікоў беларускага легальнага выдавецкага таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца» (1906—1914), студэнцкага Беларускага навукова-літаратурнага гуртка (1912—1017), Беларускага таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны (1916). Укладальнік рукапіснай «Беларускай хрэстаматыі», у якой сабраны асобныя творы Дуніна-Марцінкевіча, Лучыны, Сыракомлі, Цёткі і інш. Садзейнічаў творчаму станаўленню Янкі Купалы, быў рэдактарам яго першага зборніка «Жалейка», захаваў неапублікаваныя творы пецярбургскага перыяду (цяпер яны знаходзяцца ў Літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску).



**1925** год — нарадзіўся Павел Сцяпанавіч Куц, беларускі вучоны ў галіне прамысловай цеплаэнергетыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны вынаходнік Беларусі (2004).

**1965** год — нарадзілася Святлана Уладзіміраўна Бурага, беларуская спартсменка (лёгкая атлетыка, сямібор'е), майстар спорту СССР міжнароднага класа (1987). Удзельніца XXIV Алімпійскіх гульняў (1988), бронзавы прызёр чэмпіянату свету (1993), чэмпіёнка СССР (1987, 1988). Уладальніца Кубка Еўропы (1987, 1993, 1995), Кубка Беларусі (1997).

У свеце

**1260** год — у бітве пры Монтэ-Аперта сышліся фларэнтыйскія гвельфы і сіенскія гібеліны. Гэта былі прадстаўнікі двух палітычных плыняў у Італіі і Германіі. Гвельфы арыентаваліся на Папу Рымскага, а гібеліны — на імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі. Перамогу ў бітве атрымалі гібеліны, якія выгналі з Фларэнцыі гвельфаў.

**1975** год — выйшла ў эфір першая перадача тэлевізійнага клуба «Што? Дзе? Калі?». Яе першым тэлевядучым быў Аляксандр Маслякоў. Уладзімір Варашылаў, які шмат гадоў вёў гульню пасля яго, з першага ж выпуску перадачы працаваў у ёй пазаштатным рэжысёрам.

**1976** год — першае з'яўленне ў эфіры перадачы «У гасцях у казкі» з вядучай Валянцінай Лявонцьевай.

**1987** год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР мастацкаму кіраўніку, салістцы Дзяржаўнага акадэмічнага рускага народнага ансамбля «Расія» Людміле Зыкінай прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

У гэты ж дзень у Маскве завяршыўся суд над Матыясам Рустам. Нямецкі пілот — парушальнік мяжы — быў асуджаны да чатырох гадоў папраўчых работ. Налета яго вызвалілі.

Так гаварыў...

**НІЛ ГІЛЕВІЧ:**

*«Усіх нас прывучылі за паёк*
*Не там, дзе трэба, бачыць вінаватых».*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.23 | 19.52 | 13.29 |
| Віцебск — | 6.11 | 19.44 | 13.33 |
| Магілёў — | 6.14 | 19.42 | 13.28 |
| Гомель — | 6.13 | 19.37 | 13.24 |
| Гродна — | 6.39 | 20.07 | 13.28 |
| Брэст — | 6.42 | 20.05 | 13.23 |

### Месяц

*Поўня 2 верасня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

***Пр.*** *Аляксея, Апанаса, Васіля, Гаўрылы, Івана, Макара, Міхаіла, Фёдара.* ***К.*** *Ліліяны, Разаліі, Ружы, Майсея.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Гэта будзе цяжкая ноч, не ўсе дажывуць да світання.**

**— Мікіта, зачыні халадзільнік, гэтыя катлеты на заўтра.**

Сустракаюцца дзве сяброўкі:

— Любачка, ты ж такі добра папраўілася!

— Гэта я яшчэ схуднела! Бачыла б ты мяне месяц назад! Я была такой, як ты зараз!

Аснова дабрабыту доктара Ліпкіна грунтуецца на тонкім уменні ўтрымліваць хворага на хісткай грані паміж смерцю і выздараўленнем.

**— Ніна Валянцінаўна, як усё ж такі пахудзець?**

**— Ах, Ганначка, я вось ужо некалькі разоў садзілася на дыету!**

**— І што?**

**— Увесь час міма!**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 317 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2838.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 верасня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12